## Марфалагічны разбор назоўніка

П а р а д а к   р а з б о р у

1. Часціна мовы. Агульнае значэнне.

2. Пачатковая форма.

3. Марфалагічныя прыметы: нязменныя (агульны ці ўласны, адушаўлёны ці неадушаўлёны, асабовы ці неасабовы, канкрэтны ці абстрактны, зборны, рэчыўны; род; скланенне) і зменныя (склон, лік).

4. Сінтаксічная роля.

У з о р   р а з б о р у

*У пакоі наступіла цішыня.*

### *Вусны разбор*

(У) *пакоі* — назоўнік, абазначае прадмет (ш т о?) *пакой*; пачатковая форма — *пакой*; агульны, неадушаўлёны, неасабовы, канкрэтны; мужчынскага роду; другога скланення; ужыты ў месным склоне, адзіночным ліку.

У сказе з'яўляецца акалічнасцю.

### *Пісьмовы разбор*

(У) *пакоі* — назоўнік, прадмет; п. ф. *пакой*; агульны, неадушаўлёны, неасабовы, канкрэтны; м. р.; 2-е скл.; М. скл., адз. л.; акалічнасць.